За правы чалавека

Віцебскі рэгіянальны праваабарончы бюлетэнь

№ 12 (95) Сьнежань 2014 г.

Сяргей Каваленка арыштаваны на 10 сутак

Трое сутак да суду віцебскі актывіст КХП-БНФ ужо адбыў у ізалятары часовага ўтрыманьня, трымаючы галадоўку. Ён быў зьмешчаны пад варту 24 сьнежня – у той дзень у Віцебску быў вывешаны бел-чырвона-белы сьцяг. На судовы працэс, які адбыўся 27 сьнежня Сяргея Каваленку прывезьлі ў кайданках, што асабліва абурыла сваякоў і праваабаронцаў.

Паводле першага міліцэйскага пратаколу, Сяргей Каваленка быў затрыманы за дробнае хуліганства — нібыта недалёка ад уласнага дому ён спраўляў малую патрэбу. У другім пратаколе супрацоўнікі РАУС Першамайскага раёну напісалі, што ён не падпарадкаваўся іх патрабаваньням — адмаўляўся ехаць для разьбіральніцтва ў пастарунак.


Сяргей Каваленка

Актывіст хадайнічаў, каб яму далі час на заключэньне дамовы зь менскім адвакатам. Але судзьдзя Першамайскага райсуду Андрэй Прэйс хадайніцтва не задаволіў: ён заявіў, што ў Каваленкі быў час, каб наняць адваката, пакуль ён знаходзіўся ў ізалятары часовага ўтрыманьня. Актывіст засьведчыў, што такой магчымасьці яму не далі: у першы дзень забаранілі тэлефанаваць жонцы, каб даведацца нумар адваката, а на другі дзень сказалі, што ў ІЧУ зламаўся тэлефонны апарат.

Сяргей Каваленка хадайнічаў, каб на працэсе прысутнічаў перакладчык. Гэтае хадайніцтва было задаволенае, але запрошаны сацыяльны пэдагог сярэдняй школы №12 Алег Уласаў прадэманстраваў далёка не дастатковае валоданьне беларускай мовай. Актывіст заявіў адвод пракладчыку, але гэтае хадайніцтва не было задаволенае. Ня быў задаволены і адвод судзьдзі: судзьдзя Андрэй Прэйс абвясьціў адвод беспадстаўным.

Пасьля заўваг за рэплікі зь месца з паседжаньня выдалілі маці Сяргея Каваленкі, а сьледам і жонку, Алену Каваленку. Суд прыняў да ўвагі сьведчаньні сьведак-міліцыянтаў, якія заявілі, што актывіст зьдзейсьніў дробнае хуліганства, а потым адмаўляўся выконваць законныя патрабаваньні супрацоўнікаў міліцыі. Праўда, яны паведамілі, што ў пастарунку Каваленка паводзіў сябе адэкватна. Не парушаў дысцыпліну ён і ў ІЧУ. Тым больш незразумелым выглядала тое, што на суд актывіста прывезьлі ў кайданках.

Паводле судовага рашэньня, Сяргею Каваленку вынесеныя 10 сутак арышту: трое сутак за дробнае хуліганства, і яшчэ сем – нібыта за непадпарадкаваньне міліцыянтам. Судовую пастанову перадалі Сяргею Каваленку, жонцы даць пастанову адмовіліся, хаця яна і прасіла пра гэта, каб перадаць дакумэнты адвакату для складаньня касацыйнай скаргі.

Тэрмін арышту Сяргея Каваленкі адлічваецца з моманту затрыманьня 24 сьнежня і скончыцца 3 студзеня. На думку актывіста, які адмаўляе факты хуліганства і непадпарадкаваньня, адзіным тлумачэньнем інцыдэнту зьяўляецца тое, што 24 сьнежня ў Віцебску быў вывешаны бел-чырвона-белы сьцяг. Раней Сяргей Каваленка неаднаразова арыштоўваўся і нават адбыў турэмны тэрмін за вывешваньне ў Віцебску нацыянальных бел-чырвона-белых сьцягоў. Асабліва памятным у Віцебску стаў выпадак, калі актывіст вывесіў сьцяг на навагодняй елцы ў першых днях 2010 году.

Сёлета начальнік міліцыі грамадзкай бясьпекі МУС Віцебскага аблвыканкаму Ігар Скарыновіч паведаміў, што ў абласным цэнтры робяцца адмысловыя захады па ахове гарадзкой елкі: каля яе наладжаная кругласутачная ахова. Таксама з 24 сьнежня па 8 студзеня мясцовая міліцыя пераведзеная на ўзмоцнены варыянт нясеньня службы, і асабліва пільнымі міліцыянтам належыць быць у месцах правядзеньня масавых мерапрыемстваў, на якіх забаронена «мець пры сабе зброю або яе імітацыю, праносіць з сабой піратэхніку, сьпіртныя або іншыя напоі, карыстацца забароненай сымболікай».

У Віцебску забаранілі ладзіць фотасэсію

Праваабаронца Павал Левінаў зьвяртаўся ў адміністрацыю Чыгуначнага раёну Віцебску, куды ён паведаміў, што зьбіраецца сфатаграфавацца зь сябрамі. Пры гэтым падкрэсьліў, што ўдзельнікі фотасэсіі маюць адзіную мэту — толькі сфатаграфавацца. Аднак у адказ атрымаў ліст з забаронай: маўляў, ён ня выканаў патрабаваньняў рашэньня гарвыканкаму "Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску".

Падставай для звароту ў адміністрацыю быў інцыдэнт зь віцебскімі журналістамі і актывістамі, якіх аштрафавалі нібыта за правядзеньне несанкцыянаванай акцыі, калі іх фотаздымкі на фоне гарадзкога краявіду зьявіліся ў інтэрнэце.

"Я паведаміў у раённую адміністрацыю, што таксама зьбіраюся фатаграфавацца каля будынку з графіці — малюнкам трох клетак, зь якіх на волю вылятаюць птушкі. Адмыслова падкрэсьліў у заяве, што адзіная наша мэта — гэта фатаграфаваньне на памяць, а не выказваньне палітычных ці іншых меркаваньняў. Падкрэсьліў таксама, што людзі прыйдуць без плякатаў, транспарантаў, а таксама бяз зброі ці іншых прадметаў, якія могуць уяўляць небясьпеку для тых, хто побач... Але мне забаранілі фатаграфавацца, спаслаўшыся на рашэньне гарвыканкаму, якое тычыцца арганізацыі і правядзеньня масавых акцыяў у горадзе. Хоць я ўсялякім чынам падкрэсьліваў, што гэта будзе ня акцыя, а проста фатаграфаваньне", — гаворыць Павал Левінаў.


Павал Левінаў

Праваабаронца не выключае, што чыноўнікі нават не чыталі ўважліва ягоны допіс — адказ далі "пад капірку", аднолькавы з тымі, што даводзілася атрымліваць раней, насамрэч зьвяртаючыся па дазволы на правядзеньне масавых акцыяў. Ужо шаблённай прычынай забаронаў у Віцебску стала адсутнасьць дамоваў зь міліцыяй, цэнтральнай палiклінікай і службай ЖКГ, бо гэтыя структуры любым коштам імкнуцца ўхіліцца ад супрацоўніцтва з дэмакратычнымі актывістамі, ахвотнымі праводзіць вулічныя акцыі. Фармальная прычына адмовы ў такіх выпадках — гэта невыкананьне патрабаваньняў рашэньня Віцебскага гарвыканкаму №881, дзе прапісаная неабходнасьць мець дамовы.

"Чыноўнікі ў Чыгуначнай адміністрацыі непісьменныя, што да заканадаўства. Не чыталі закону аб масавых мерапрыемствах, і таму ня ведаюць, што ён рэгулюе толькі правядзеньне пікетаў, шэсьцяў, а ніяк не групавых фотасэсіяў. Паводле лёгікі чыноўнікаў, кожны турыст, які захоча сфатаграфавацца на фоне гарадзкога краявіду, ужо патэнцыйны правапарушальнік", — кажа праваабаронца.

У Віцебску зноў забаранілі пікеты

Заяўкі ў тры раённыя адміністрацыі Віцебску падаваў праваабаронца Павал Левінаў. Ён хацеў правесьці тры аднахвілінныя пікеты ў розных раёнах гораду ў Дзень правоў чалавека, 10 сьнежня. Але атрымаў ужо традыцыйныя, шаблённыя забароны.

Віцебскі праваабаронца ўжо ня першы раз спрабуе прадэманстраваць, што віцебскія чыноўнікі, абапіраючыся ў сваіх адмовах на недасканалае рашэньне віцебскага гарвыканкаму "Аб масавых мерапрыемствах у г. Віцебску", самі ствараюць няёмкія сытуацыі.

"Згодна з гэтым рашэньнем, да заяўкі на пікет я мушу прыкласьці дамовы на абслугоўваньне акцыяў, заключаныя зь міліцыяй, палiклінікай і службай ЖКГ. Дамовы падпісваць усе яны адмаўляюцца, і праз гэта заяўнікам забараняюць акцыі. У мяне таксама не атрымалася дамовіцца са згаданымі структурамі. Тады я падаў такія заяўкі, дзе выкананьне патрабаваньняў гарвыканкаму выглядае абсурдным. Па-першае, усе тры мае пікеты разьлічаныя на адну хвіліну. Навошта тады дзяжурства ўрачоў, міліцыі і дворнікаў-прыбіральшчыкаў? Па-другое, пікеты я запланаваў у адмыслова вызначаных месцах, але ў незвычайны час: адзін а 8-й раніцы, другі ў абед, а трэці — а 21:59 вечара — роўна на адну хвіліну да сканчэньня тэрміну, пакуль законам дазваляецца праводзіць акцыі. Вынік той самы, што і раней: у адказ на тры заяўкі — тры забароны", — кажа Павал Левінаў.

Праваабаронца адзначае, што з часу прыняцьця ў 2009 годзе таго самага рашэньня віцебскага гарвыканкаму ў горадзе не было дазволена ніводнага масавага мерапрыемства з ініцыятывы прадстаўнікоў дэмакратычных сіл. На думку Паўла Левінава, у абласным цэнтры ўвесь гэты час парушаюцца правы грамадзян на мірныя сходы і вольнае выказваньне сваіх меркаваньняў.

Павал Левінаў абраў уласную тактыку змаганьня ў гэтай сытуацыі: сваімі заявамі на акцыі ён даводзіць сытуацыю з забаронамі да поўнага абсурду. Ён спадзяецца, што нарэшце прадстаўнікам улады стане няёмка выглядаць у вачох грамадзян нейкімі дзівакамі, забараняючы праваабаронцу схадзіць у краму, бо гэта можна разглядаць як "шэсьце" па Віцебску. Або, напрыклад, забараніўшы сход грамадзян, дзе мелася ісьці гаворка пра здаровы лад жыцьця — такі сход Павал Левінаў быў гатовы правесьці ў лазьні.

Аднахвіліныя пікеты праваабаронца таксама заматляе не ўпершыню, але гэтаксама стабільна атрымлівае забароны замест дазволаў.

Мясцовыя ўлады праігнаравалі прапановы віцебскага праваабаронцы



Леанід Сьвецік

10 сьнежня − Дзень правоў чалавека, які адзначаецца ва ўсім сьвеце. У гэты дзень у 1948 годзе Генэральная асамблея ААН прыняла Ўсеагульную дэклярацыю правоў чалавека. Месяц таму віцебскі праваабаронца Леанід Сьвецік накіраваў шэраг прапановаў мясцовым уладам і дзяржаўным СМІ рэгіёну, што да адзначэньня гэтай важнай даты, але ўсе ягоныя прапановы былі фактычна праігнараваныя.

Таксама падавалася заяўка на правядзеньне 10 сьнежня пікету з мэтай публічна адзначыць 66-годзьдзе прыняцьця Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека. І хоць месцам правядзеньня пікету была пазначаная адна з трох пляцовак у горадзе, адмыслова адведзеных мясцовымі ўладамі пад масавыя мерапрыемствы, намесьнік кіраўніка адміністрацыі Чыгуначнага раёну Віцебску Аляксандар Ільмовіч акцыю забараніў: маўляў, арганізатар пікету не далучыў да заяўкі дамоваў, прадугледжаных рашэньнем гарвыканкаму.


Леанід Сьвецік прапанаваў Віцебскаму гарвыканкаму і Віцебскаму савету дэпутатаў зладзіць круглы стол з удзелам прадстаўнікоў гарадзкіх органаў улады, праваабаронцаў, лідэраў грамадзкіх аб'яднаньняў і палітычных партыяў, а таксама журналістаў. У межах круглага стала прапанавалася абмеркаваць стан грамадзянскіх і палітычных правоў у Віцебску, а таксама праінфармаваць жыхароў гораду пра магчымасьці і спосабы абароны эканамічных, сацыяльных і культурных правоў.

«Паведамляем, што выканаўчым камітэтам не заплянаванае правядзеньне «круглага стала», прысьвечанага 66-годзьдзю прыняцьця Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека», — коратка адказаў на прапанову намесьнік старшыні гарвыканкаму Ўладзімер Шлома. А з гарадзкога савету дэпутатаў адказу праваабаронца так і не дачакаўся.

Не атрымаў ніякага адказу Леанід Сьвецік і з гарадзкой газэты «Віцьбічы», галоўнаму рэдактару якой ён прапанаваў падрыхтаваць публікацыі на тэму правоў чалавека, у тым ліку ўзяць інтэрвію з праваабаронцамі. Затое адказала дырэктарка тэлерадыёкампаніі «Віцебск» Алена Панцюхова, на імя якой дасылалася падобная прапанова. «Безумоўна, прапанаваная Вамі тэма цікавая, аднак на стварэньне тэлеперадачы, прысьвечанай 66-годзьдзю прыняцьця Ўсеагульнай дэклярацыі правоў чалавека, у РУПРТЦ «Тэлерадыёкампанія «Віцебск» выдаткаваньне грашовых сродкаў заплянаванае не было», — напісала яна.

«Праваабаронцы зьвяртаюцца да дзяржаўных органаў, арганізацыяў і СМІ з прапановамі сумесна прасоўваць у масы ідэі правоў чалавека, прававой дзяржавы, міжнародныя стандарты ў сфэры правоў чалавека, а тыя і «носам не вядуць». Некаторыя нават фармальна не адказваюць на лісты. Гэта абуральна», − пракамэнтаваў Леанід Сьвецік рэакцыю ўладаў і дзяржаўных СМІ на яго прапановы.

Пасьля вызваленьня Гайдукова адразу арыштавалі



Андрэй Гайдукоў

Сябра аргкамітэту па стварэньні партыі «Беларуская хрысьціянская дэмакратыя» Андрэя Гайдукова 5 сьнежня асудзілі на 5 сутак арышту за раздачу ўлётак у падтрымку палітвязьняў. Суд адбыўся адразу пасьля таго, як актывіста выпусьцілі з-за кратаў пасьля 10-дзённага арышту за раздачу ўлётак.

«Маці бачыла актывіста толькі 20 хвілін. Ён хворы: у яго кашаль, баліць горла», — паведаміла каардынатарка аргкамітэту па стварэньні партыі БХД па Віцебшчыне Тацьцяна Севярынец.

Андрэя Гайдукова затрымлівалі за раздачу ўлётак 21 лістапада ў Наваполацку і 24 лістапада ў Полацку. 25 лістапада за адну з акцыяў яго асудзілі на 10 сутак.

Віцебскім журналістам не ўдалося аспрэчыць штрафы за ўдзел у фотасэсіі на фоне графіці



24 сьнежня ў Віцебскім абласным судзе разглядаліся касацыйныя скаргі журналістаў і актывістаў, пакараных штрафамі за фатаграфаваньне з птушкамі і клеткамі. Справы шасьці ўдзельнікаў фотасэсіі разьбіралі розныя судзьдзі — Эдгар Марцірасян, Сьвятлана Іванова і Ірына Смалякова, — але вынік іх разбораў аднолькавы: скаргі задаволеныя не былі, рашэньні, прынятыя судом Чыгуначнага раёну, пакінутыя бязь зьменаў.

Судзьдзі абласнога суду не пагадзіліся з аргумэнтамі пакараных, якія сьцьвярджалі, што фотасэсія не зьяўляецца пікетаваньнем або іншым масавым мерапрыемствам, на правядзеньне якога трэба браць дазвол. Таксама не былі ўзятыя пад увагу спасылкі на шматлікія працэсуальныя парушэньні, дапушчаныя судом першай інстанцыі.

«Я не чакаў нічога добрага ад гэтага суду, таму што ведаю, што наша судовая сыстэма створаная не дзеля абароны правоў людзей, а дзеля абароны рэжыму. Таму вынік быў вядомы», — пракамэнтаваў рашэньне судзьдзі абласнога суду адзін з удзельнікаў фотасэсіі, незалежны журналіст Кастусь Мардзьвінцаў.

Сябры Беларускай асацыяцыі журналістаў Алена Сьцяпанава, Зьміцер Казакевіч, Кастусь Мардзьвінцаў, Алена Шабуня, Павал Левінаў, а таксама **актывістка аргкамітэту па стварэньні партыі БХД Тацьцяна Севярынец** на пачатку лістапада сфатаграфаваліся на фоне гарадзкога графіці з птушкамі і клеткамі, зробленымі з паперы. Фотаздымкі былі выкладзеныя ў інтэрнэт. Справай заняліся міліцыянты, якія палічылі ўдзел у фотасэсіі несанкцыянаваным пікетам. На ўдзельнікаў фотасэсіі склалі пратаколы, пасьля яны былі пакараныя штрафамі ў памеры ад 18-ці да 25-ці базавых велічынь.

Яшчэ адзін удзельнік фотасэсіі, выпадковы мінак **Пётар Берлінаў**, быў пакараны 3-дзённым арыштам. Ён таксама падаваў касацыйную скаргу, якую абласны суд разгледзеў у паскораным парадку раней. Прычым, як сьцьвярджае спадар Берлінаў, павестку з інфармацыяй пра дату і час суду ён атрымаў на наступны дзень пасьля таго, як судовы разгляд яго скаргі ўжо адбыўся. Вынік такі самы: абласны суд прызнаў пакараньне за ўдзел у фотасэсіі справядлівым.

Суд прызнаў актывістаў «Сумленнай улады» дробнымі хуліганамі

Па 25 базавых велічынь штрафу сябрам стваранага міжнароднага аб'яднаньня «За сумленную ўладу» Пятру Іванову і Аляксандру Холаду і 10 базавых велічынь Пятру Берлінаву — такое рашэньне абвясьціла 23 сьнежня судзьдзя суду Першамайскага раёну Віцебску Натальля Карабліна. Усе трое былі прызнаныя вінаватымі ў парушэньні артыкулу 17.1 КаАП (дробнае хуліганства).

Актывістаў абвінавацілі ў тым, што 5 сьнежня яны нібыта незаконна ўварваліся на ўчастак, дзе стаяў дом Пятра Берлінава, які згодна з рашэньнем мясцовых уладаў падлягаў зносу, зламалі пры гэтым весьнічкі і зьбілі вартаўніка. У якасьці доказу віны абвінавачаных выкарыстоўваўся дыск з відэазапісам і паказаньні сьведак.

Распавядае Пётар Берлінаў: *«Зямля знаходзілася ў маім карыстаньні, я прыйшоў на сваю зямлю. «Жылбуд» сваім лістом мяне раней апавясьціў, што я ў любы час магу прыходзіць і забіраць сваю маёмасьць. Але вартаўнік мяне не пускаў. Гэтак было неаднаразова. 5-га числа я прывёў на ўчастак сваіх знаёмых, каб яны засьведчылі, што чыніцца беззаконьне. Мы нічога неправамернага не зьдзяйсьнялі, парадак не парушалі — мы проста прыйшлі на мой участак. Я адчыніў весьнічкі правільна — унутар, не ламаў іх. А нас абвінавацілі, што мы іх зламалі. Ды напалі на вартаўніка. Хаця гэта ён мне парваў куртку і швэдар, спрабуючы нас не пусьціць».*

Галоўным сьведкам на судзе выступаў вартаўнік, нібыта зьбіты актывістамі. Паводле словаў спадара Берлінава, адказы вартаўніка на пытаньні судзьдзі былі супярэчлівымі, ён блытаўся ў сваіх паказаньнях. Вартаўнік сьцьвярджаў, што актывісты зламалі весьнічкі, павалілі яго ды ўтраіх ляжалі на ім. Ніхто зь іншых сьведкаў гэтага не пацьвердзіў.



Пётар Берлінаў

Што тычыцца астатніх сьведак — двух рабочых «Жылбуду», якія працавалі на ўчастку падчас інцыдэнту, — дык яны спрабавалі казаць праўду. *«Сьведкі пацьвердзілі, што мы падышлі, прадставіліся. Хаця вартаўнік казаў, што мы падбеглі, пачалі нагамі біць па брамцы мэталёвай* — кажа Берлінаў. — *Аднак судзьдзя Караблiна пачынала задаваць ім навадныя пытаньні, каб у выніку яны блыталіся і сьведчылі супраць нас».*

«Напрыклад, заходзіць сьведка. Я і іншыя задаюць яму пытаньне: Ці гучаў з нашага боку мат? Ён: Не, не гучаў. А судзьдзя тады запытваецца: Ці ўсё поўнасьцю, ад пачатку да канца вы чулі, усе размовы? Або, мабыць, нешта маглі ня чуць? То бок судзьдзя наводзіла сьведку на тое, каб ён сказаў, што, маўляў, так, я мог не пачуць нейкіх словаў».

Актывісты ўпэўненыя, што іх пакаралі штрафам незаконна.

Бюлетэнь “За правы чалавека” выдаецца праваабаронцамі Віцебскага рэгіёну.
Наклад 299 асобнікаў.
Пры падрыхтоўцы бюлетэня выкарыстоўваліся матэрыялы сайта http://prava.vitebsk.cc і іншыя Інтэрнэт-рэсурсы.